Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem

Цана асобнага нумару 20 грошаў.

НАРОДНАЯ СПРАВА

Выходзіць два разы ў тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6. (Wileńska 12, m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок пятыту ў 1 шпальту.

№. 32 Вільня, Субота, 6-га лістапада 1926 г. Год I

На шляху да перамогі.

Паход проці масавае арганізацыі беларускага сялянства і работнікаў, які ад прэсавых заклікаў паноў Обстаў, Цатаў і Боргаў *перайшоў ужо да адміністрацыйных рэпрэсіяў*, — гэта найлепшы доказ еднасьці ўсяго польскага буржуазнага грамадзянства ў пытаньнях нацыянальнае палітыкі. Калі паасобныя групы ў нечым і разыходзяцца, дык ня ў самай аснове гэтае палітыкі, а выключна ў паглядах на тое, *якімі спосабамі* лепш дайсьці да роўна пажаданае для ўсіх мэты. Так, эндэкі і абшарнікі клічуць уладу да самых жорсткіх выступленьняў проці беларусаў і ўкраінцаў, не ўкрываючы запраўднае мэты польскае палітыкі,—а вось паны „дэмакраты“ і пілсудчыкі дык прыкрываюцца сваей нібы-то „прыхільнасьцяй“ да нашага вызвольнага руху, манючыся „ласкай“ залучыць беларускія масы ў хітра расстаўленыя ім сеткі....

Ясна для кожнага, што *спадзявацца на польскую буржуазію* таго ці іншага кірунку—*нам няма чаго*! І пакуль у Польшчы ня скончыцца пара дыктатуры буржуазіі, датуль мы ня можам разьлічаць навет на самую абмяжованую свабоду ў працы над зьдзейсьненьнем нашых нацыянальных і сацыяльных ідэалаў.

Які-ж з гэтага вывад?— Ці, паддаўшыся паніцы пасьля першых новых рэпрэсіў, якія пасыпаліся на нас сьледам за прэсавай кампаніяй проці „Грамады“, апусьціць рукі і ждаць, пакуль у Польшчы зробіцца нейкая перамена?!

Ды нікoлі!

„Пакуль сонца ўзыйдзе, раса вочы выесьць!“—гэтая запраўды-ж мудрая народная прыказка хай выжане ў нас з галоў навет самую думку аб падобным адступленьні ў барацьбе за нашыя слушныя і законныя правы. Усялякі тэрор усюды і заўсёды і разьлічае на тое, што страх перад магчымымі ахвярамі можа разьбіць нэрвы байцоў, зьнішчыць іх барацьбяную энэргію і духовую сілу. А тады—час зробіць сваё: *спыненьне барацьбы—гэта ўжо паражэньне*, і пераможцы ў хуткім часе здолеюць замацаваць для сябе вынікі ачышчэньня поля бітвы.

Мы паддавацца нейкай паніцы з прычыны таго, што недзе нехта несправядліва пакараў ці вастрогам, ці штрафам актыўнага грамадзіста,—*не павінны.* Тым балей, што ў сучаснай Польшчы ня мы адны, не адны толькі нашы найбліжэйшыя суседзі ўкраінцы і літвіны знаходзяцца ў падобным да нашага палажэньні, але *і польскія працоўныя мест і вёсак*. Так: аб'яднаная на груньце барацьбы з нацыянальнымі меншасьцямі польская буржуазія становіцца, як адзін мур, і супраць „сваіх“ працоўных масаў, жадаючы за ўсялякую цану захаваць сучасную палітычную раўнавагу, пры якой яна так крэпка сядзіць на карку работніка і селяніна. І толькі з аднаго пагляду польскаму работніку і селяніну гарапашніку лепей, чым нам: з пагляду нацыянальнае свабоды.

Ясна, што на доўгім шляху барацьбы за сацыяльнае вызваленьне нашы каляіны зыходзяцца з каляінамі польскага пралетарыяту і сялянскае беднаты, ня гледзячы на тое, што буржуазія стараецца гэтых нашых натуральных саюзьнікаў нацкаваць проці нас, паказуючы ім „вялізарныя вольныя абшары зямлі на ўсходніх крэсах“..... А ўзрост сяцыяльнае сьвядомасьці польскіх працоўных масаў разаб'е аканчальна хітрыя мяркаваньні „нашых і вашых“ ворагаў.

Мы верым, што ўзрост сьвядомасьці і арганізованае сілы працоўных Польшчы наагул з кожным днём будзе рабіць усё новыя заваяваньні. Мы верым, што — раней ці пазьней--сацыяльная барацьба ў Польшчы мусіць закончыцца *перамогай работніцкіх масаў*. І гэта будзе адначасна *і наша перамога*: працоўныя ня могуць трымаць у няволі працоўных!

Мы верым, што *беларускі нацыянальны вызвольны рух дасягне сваей мэты толькі адначасна з перамогай сацыяльнага руху* і на гэтым будуем нашу палітыку. Дык — ў адказ на ўзмацненьне нацыянальных рэпрэсіяў проці нас—мы мусім і на нашай зямлі *ўзмацаваць рух сацыяльны*, — ведама, ні на мамэнт *ня спыняючы нацыянальнага змаганьня*—перадусім шляхам тварэньня вечных і нязьнішчальных сваіх культурных цэннасьцяў, культурнае сілы.

Дык *не палохацца, не апускаць рук* у барацьбе і творчай працы! — Перамога будзе наша!

Павадыры Р.К.П. аб магчымасьцях вайны.

У сувязі з дакладам Бухарына на камуністычным кангрэсе ў Маскве (—аб міжнародным палажэньні) ўзьнялася дыскусія аб магчымасьці новай вайны. Сам Бухарын лічыў вайну ў хуткім часе мала пэўнай. Іншыя аратары, наадварот, лічылі, што яна няўхільна падгатаўляецца—у некалькіх пунктах сьвету. У Эўропе цяпер ствараюцца дзьве групіроўкі дзяржаваў: француска-нямецкая і англійска-італьянская, у выніку чаго будзе завастрацца ў сярэдняй эўропе барацьба проці Англіі, якая можа давясьці да новага выбуху (ведама, як ужо падпаляе Англія „выбуховую“ галаву Мусоліні!..).

На шляхох сусьветнай палітыкі аратары адзначалі два вялікія „вузлавыя пункты“, на парозе якіх падрыхтоўваюцца ваенныя канфлікты. Гэта Ціхі акіян і Сяродземнае мора. Апрача таго, нарастае вялізарная барацьба за панаваньне над сусьветнымі марскімі шляхамі—між Англіяй і Амэрыкай. Новы, усё магутнеючы імпэрыялізм Амэрыкі паступова выціскае ды пабівае старэючы англійскі імпэрыялізм. Але апошні без вялікай, адчайнай барацьбы ня здасцца, хаця, бяз усякага сумліву, будзе пабіты ганебна, дый не аднэй Амэрыкай. Зьмяніць гэты свой няўхільны лёс буржуазная Англія здолела-б толькі сацыяльнай рэвалюцыяй.

Што датычыць Радавага Саюзу, дык аратары сьцьвярдзілі дзьве галоўныя небясьпекі вайны для яго: на шляхох да злучэньня сялян і работнікаў Саюзу з заходнім пралетарыятам, на якіх ляжаць бар'ерам Польшча і Румынія, і—на шляхох лучнасьці вольных народаў СССР з вызваляючыміся народамі Усходу — у Сярэдняй Азіі і Кітаі. Адмовіцца ад гэтай лучнасьці СССР ня можа, дык за гэтыя шляхі ўжо ідзе, усё завастраючыся, барацьба, якая і можа ў кожны мамэнт давясьці да канфлікту. Што да гэтага канфлікту рыхтуюцца буржуазныя дзяржавы Захаду, якім гэтая лучнасьць пагражае сьмерцяй, — гэта сьцьвярджалі ўсе прамоўцы.

У Сойме.

„Апрацоўка цэрэманіялу“.

„Упарты літвін“, відаць, ня так лёгка дасьць сябе парамагчы Сойму ды нават прэзыдэнту... Калі прэзыдэнт напісаў прэм. Пілсудскаму, што згаджаецца з думкай Канвэнту Старшын Сойму асабіста адчыніць сэсію Сойму, марш. Пілсудскі адказаў, што тады трэба адлажыць дзень адчыненьня, бо ўрад ня можа ў адны суткі зрабіць усе патрэбныя для „гэткай урачыстасьці“ распараджэньні... Газэты пісалі тады, што на гэтую падгатоўку урад патрэбаваў 3 дні, дык Сойм меў адчыніцца ў сераду 3 лістапада.

Пасьля выясьнілася, што трэба яшчэ „апрацаваць цэрамонію“ (урачысты парадак) гэтага важнага акту пана прэзыдэнта (прачытаць некалькі слоў свайго дэкрэту)..., а на гэта трэба ўжо наймэнш... 2 тыдні часу! Дык Сойм можа пачаць працу толькі каля паловы месяца..,

Цяпер апошнія газэты пішуць, што яшчэ зусім няведама, калі гэта „апрацаваньне“ будзе скончана дый калі адчыніцца Сойм...

Марш. Пілсудскі хоча — для вялікшай павагі Галавы дзяржавы—зрабіць з акту адчыненьня — „нешта нячуванае яшчэ ў Польшчы“... У урачыстасьці—на першым пляне—мае прыняць учасьце... войска. Кожны рух кожнага ўчасьніка мае быць згары „апрацаваны ды вызначаны“, як... у часе фатаграфаваньня сцэнаў для кінэматаграфаў... Міністэрскія галовы — пад асабістым найпільнейшым кіраўніцтвам пана прэм'ера ламаюць цяпер найважнейшымі пытаньнямі: каму стаяць побач з панам Прэзыдэнтам—ці старшыні Сойму, ці старшыні ўраду, дый — каму зьлева, а каму справа... І г. д.

„Працы“—бяз ліку!—трэба-ж усё „ствараць нанова“, дык польскаму „паньствова творчаму генію“—„поле да папісаў“ вялікае...

Характэрна адзначыць, паміж іншым, наступнае.

Толькі-што зьмененая Канстытуцыя выразна трэбуе, каб Сойм распачаў восенскую бюджэтную сэсію—ў кастрычніку. Неспадзяваны „канфлікт“ прэм. Пілсудскага з Соймам зрабіў гэта немагчымым. Дык трэба было неяк—ратаваць „пазоры“ Канстытуцыі. І вось найвышэйшыя ўлады ў Польшчы пастанавілі: яшчэ ў кастрычніку выдаць дэкрэт аб скліканьні Парлямэнту. Дык „роўна“ ў апошнюю чэцьверць гадзіны апошняга дня кастрычніка, бо ў 23 гадз. і 45 мін. у начы 31.X, — выйшаў з друку чарговы нумар „Монітора“ (афіцыяльны орган ураду), дзе і былі зьмешчаны абодва дэкрэты пана прэзыдэнта — аб скліканьні Сойму і Сэнату, толькі вось— **без вызначэньня дня, калі гэта мае быць зроблена!**

Тэрмін склінаньня Сойму.

Толькі 4-га лістапада Прэзыдэнт вызначыў адчыненьне Сойму і Сэнату на 13-га лістапада. Адчыняць будзе сам — асабіста.

Справа зьмены Выбарнага Закону.

Прэса падала вестку аб тым, быццам урад сьпешна апрацоўвае новы Выбарны Закон, каб правясьці яго хутка праз Сойм. Урадавая прэса запярэчыла гэтай вестцы, дадаўшы што ў Сойм пададзены ужо аж 3 праекты зьмены Ордынацыі, дык камісія мае сама заняцца гэтай справай. Але газэты і пасьля гэтага запярэчаньня ўпорна пішуць, што ўрад працуе над новым законам, жадаючы сам зрабіць для Сойму нешта гатовае і адзінае з усіх тых хіена пястоўскіх праектаў, якія ляжаць у камісіі Сойму. Што большасьць у Сойме для самых проці-дэмакратычных зьменаў у выбарным Законе знойдецца, у гэтым ня можна сумлявацца. За тое-ж і дзержыцца сучасны урад за гэты Сойм — зубамі...

Водгукі Нясьвіжа.

„Гаспадарчыя вынікі“.

Шырока і гучна рэклямаваная ўрадам і яго казённай прэсай—кампанія проці падвышкі цэнаў на прадметы першай патрэбы аказалася, як і трэба было спадзявацца, папросту—рэклямай... Цана на ўсё, а ў першую чаргу на хлеб, расьце й расьце... Голас спажыўца, па сколькі ён мае доступ у прэсу, крычыць: „спыніць спэкуляцыю пекароў, млынароў ды абшарнікаў“! Пекары наракаюць на млынароў, млынары-ж—на абшарнікаў, дамагаючыся ў першую чаргу—забароны вывазу хлеба заграніцу..

Але ўрад, маючы ў сваім лоне 4—5 абшарнікаў, навет вухам не кране...

Навет эндэцкая прэса сцьвярджае, што цана на хлеб паднялася—зусім беспадстаўна! —за год аж на 100 працэнтаў, ці — якраз удвая! Навет бутэрбродная прэса зразумела, якую пагрозу нясе для „сацыяльнага спакою“ ў краі — гэтая бясспынная падвышка цэнаў на хлеб. Але ўрад вывазу збожжа абшарнікамі заграніцу, дзе яно даражэйшае, ня спыняе, і цана на хлеб далей расьце.

Ці памысьлілі аб магчымых выніках гэтага аранжэры „палітычнай дэманстрацыі“ ў Нясьвіжы, ці мелі час на гэтую „драбязу“? Бо-ж на апрацаваньне рэпрэсіяў проці „Грамады“, ды на пастанову аб тым, каб... вярнуць у Польшчу з Расеі труну з трупам апошняга польскага караля — Станіслава-Аўгуста—дзеля яго ўваскрашэньня ў сучаснай Польшчы—на гэта ўсё, як пішуць газэты, часу хапіла аж зашмат...

„Манархія — ня мэта, але — срэдства“...

„Антыпаньствовая“ — эндэцкая — прэса дасьціпна разшыфроўвае мэты і пляны марш. Пілсудскага.

„Трэба думаць, што Пілсудскі зрабіўся цяпер яўным прыхільнікам манархіі. Але манархія сама па сабе ня можа быць яшчэ самамэтай: яна—срэдства для зьдзейсьненьня пэўных мэтаў. Якая-ж гэта мэта? — Можна думаць з раду тлумачэньняў бэльвэдэрскай прэсы, што гэта—ідэя фэдаралістычнай арганізацыі ўсходняй Эўропы... Упорна ходзіць чутка, быццам гэткія пляны падсоўвае ды вельмі падтрымлівае Англія... Пры гэтым трэба ведаць, што асабістыя адносіны марш. Пілсудскага з англійскім паслом у Варшаве Максам Мюлерам—вельмі блізкія, дый што ў інтарэсе Англіі — каб ня было між Польшчай і Расеяй залішне добрых адносінаў... А калі дадаць яшчэ, што ўвесь Нясьвіжскі зьезд быў наладжаны манархістамі з-за ўсходняга кардону,—тымі абшарнікамі ды магнатамі, якія ніяк яшчэ ня могуць адхварэць таго, што часьць іх вялізарных абшараў асталася на расейскім баку“..

Калі ўжо навет эндэцкая прэса закідае польскаму манархізму такія мэты, дык пэўна-ж—няма дыму без агня...

Чуткі аб пазычцы.

Газэты пішуць, быццам на Варшаўскай біржы ўпорліва ходзіць чутка, быццам польскі ўрад атрымаў нарэшце згоду англійскіх банкіраў на значную пазыку. Банкіры толькі ставяць варункам, каб — побач з падпісам польскага ўраду — стаялі таксама на вэксэлі падпісы... найбуйнейшых польскіх магнатаў-абшарнікаў, якія забясьпечылі-б пазыку заставам сваіх маёнткаў англійскім банкірам... Быццам у Нясьвіжы польскія абшарнікі згадзіліся на гэты заставу, толькі пад цэлым радам варункаў, а ў першую чаргу—пад варункам скасаваньня зямельнай рэформы, навет тэй, якая ўжо сталася законам... Ці згадзіўся на гэткі варунак урад?—Няведама. Здаецца толькі, што ўваход некалькіх павадыроў польскага абшарніцтва ў яго склад дае даволі красамоўны адказ на гэтае пытаньне..

Якая-ж дынастыя?

Нясьвіжскія ўрачыстасьці гучным рэхам пранясьліся па ўсей — ня толькі польскай, але і заграпічнай прэсе. Вось, напрыклад, адна з француcкіх газэт паведамляе, быццам у Нясьвіжы зроблены першы рашучы крок на шляху адраджэньня манархіі ў Польшчы. Але манархам мае быць ня Пілсудскі, але адзін з „князёў“ Радзівілаў, род якіх злучаны крывёй не з адным каралеўскім домам Эўропы. Каралём Польшчы мае быць Януш Радзівіл, ,але пакуль-што гэта ўсё трымаецца ў сэкрэце...

Так піша газэта. Праўда,—з гэтым вельмі добра вяжацца той „дынастычны тост“, які падняў марш. Пілсудскі—за „вечнасьць дому Радзівілаў у Польшчы“... Але ёсьць і запярэчаньні гэтага.

Так, эндэцкая газэта „Слово Польске“ падае чутку, быццам арганізацыя манархістаў на адным з апошніх паседжаньняў прыняла пастанову — запрасіць на польскі трон аднаго з англійскіх прынцаў. На гэта быццам ёсьць ужо згода Англіі. Марш. Пілсудскі быў-бы тады—рэгентам (кіраўніком дзяржавы). Пад новым каралём Польшча пачала-б тады праводзіць у жыцьцё думку Пілсудскага—аб „зьбіраньні ўсіх даўнейшых земель стара-шляхоцкай Рэчыпаспалітай“...

Калі так, дык ясна: як-жа тады — без абшарнікаў, асабліва менскіх, магілёўскіх, кіеўскіх ды іншых?!

А вось што для „хамаў“.

У партыйнай часопісі „Вызваленьне“ расказваецца, як была выгнана з ваеннага міністэрства дэлегацыя сялян, якая хацела дабіцца прыёму ў самога марш. Пілсудскага. Калі, пасьля рашучай адмовы прыняць іх, сяляне круціліся яшчэ ў міністэрстве, на іх наляцелі розныя „вайсковыя дэмакраты“ марш. Пілсудскага з гэткім крыкам: (паўтараем паводле „Рэчыпаспалітай“): „Ах, так гэта вы, хамы, яшчэ тутака круціцеся? Яшчэ вас згэтуль ня выгналі? Пашлі вон адсюль“!.. Тая-ж газэта ў канцы дадае: — „Што-ж рабіць: такі цяпер дух часу. Хамы вон! А ў Нясьвіжы „магнаты банкетуюць“ ды паляць цыгары з „тварцом маёвага перавароту“; аж зьбялеўшы сацыялістычны „Роботнік“ пытаецца: „Што ж гэта ўсё значыць“?

У Польшчы.

Скарпіёны на прэсу.

На адным з апошніх паседжаньняў Рады Міністраў быў установлены тэкст дэкрэту Прэзыдэнта ў справе новых скарпіёнаў на прэсу. За пашырэньне „няпраўдзівых або перакручаных“ вестак, датыкаючых справы абароны дзяржавы ці дзеяльнасьці дзяржаўных уладаў і іх прадстаўнікоў,—а таксама за „зьневажаньне“ уладаў і іх агентаў прадугледжаны кары ад 200 да 5.000 злот. штрафу з заменай арыштам ад 1 да 6 тыдняў.

Як відаць, кепска дасюляшнія канфіскацыі адміністрацыяй газэт за такія правіннасьці і „нармальныя“ судовыя прыгаворы дасягаюць мэты. Дык, як за царскіх часоў, будуць „біць па кішані“, матар'яльна руйнуючы няпрыемныя уладам часопісі...

Для каго дзяржава мае грошы?

Як піша „Głos Prawdy“, урад дараваў вядомаму скупшчыку Польшчы, Гарыману, 30 міліёнаў злотых маёнтковага падатку...

Для каго дзяржава ня мае грошы?

Міністэрства скарбу зьмяншае крэдыты на помач безработным. Гэтак для безработных умысловых працаўнікоў урад вызначыў на травень 400 тысяч злотых, на чэрвень 350 т. зл., на ліпень 300 т. зл. На верасень урад вызначыў толькі 250 т. зл. Адначасна ўрад імкнецца да агранічэньня помачы для безработных работнікаў.

Цэнтральная Камісія Праф. Саюзаў, апанаваная праз ППС, як быццам гэтага не прыкмячае і заховываецца да гэтага часу бясчынна.

З антыпаньствоўца—у міністры.

Газэты прыпамінаюць, што некалькі тыдняў таму міністар унутраных спраў Млодзяноўскі зачыніў Польскае Манархічнае Аб'яднаньне, як партыю, якая ставіць сабе мэтай „замах стану“. На чале гэтага Манархічнага Аб'яднаньня, як стаяў, так і стаіць той самы... п. Мэйштовіч, які цяпер назначаны Пілсудскім за міністра справядлівасьці, ці—за ахоўцу таго самага дзяржаўнага ладу, на які Аб'яднаньне толькі-што плянавала замах...

Шпарка круціцца „польскае кола“ гісторыі. Толькі вось,—куды яно едзе, на гэта дык ніхто, навет сам Пілсудскі, ня дасьць адказу...

Ці будзе легалізавана арганізацыя манархістаў.

Эндэцкія газэты вельмі цікавяцца: ці будзе ізноў, пасьля „Нясьвіжа“, легалізавана манархічная арганізацыя ў Польшчы, якую толькі-што зачыніў, як антыдзяржаўную, міністар-пілсудчык Млодзяноўскі?! Бо-ж мы чулі, як у Нясьвіжы і „князь“ Сапега і іншыя адкрыта віталі галаву польскага ўраду, як афіцыяльныя прадстаўнікі розных манархічных арганізацыяў...

Голас пазнанскіх рабочых.

На трохтысячным мітынгу, сазваным Міжпартыйным Сэкрэтарыятам для Барацьбы за Амністыю, была выбрана дэлегацыя з 6 асоб да адміністрацыйных і судовых уладаў з дамаганьнямі спыненьня рэпрэсіяў супроць руху рабочых, сялян і нацыянальных меншасьцяў.

Правал ППС у Пазнані.

У Пазнані адбыўся мітынг, склікаваны Радай Праф. Саюзаў Пазнані ў справе 25-х угодак заснаваньня Прафэсіянальнага Інтэрнацыяналу. — ППС імкнуліся накінуць свой парадак дзенны—бяз права голасу для лявіцы і бяз дыскусіі. Сабраныя ў лічбе 5000 работнікі вялізарнай большасьцяй галасоў (звыш 4000 проціў 25 галасоў пэпээсаўскай баёўкі!) адкінулі пэпээсаўскі парадак дня і ўключылі ў яго даклад прадстаўніка Камітэту Еднасьці Праф. Саюзаў.

Прынятая амаль аднагалосна рэзалюцыя дамагаецца, каб Цэнтральная Камісія прылучылася да Англійска-Радавага Камітэту Еднасьці Праф. Саюзаў, каб спыніла рэпрэсіі і тэрор супроць дзеячоў лявіцы і цэлых апазіцыйных Праф. Саюзаў. Далей у вострых словах асуджае мілітарызм і ваенныя прыгатаваньні сучаснага ўраду. Напаканцы прызывае да барацьбы за сацыяльнае вызваленьне і работніцка-сялянскі ўрад.

Дабравольныя каты буржуазіі.

Апошнімі часамі ў Варшаве адбываецца эпідэмія палітычных забойстваў сярод работнікаў — дзякуючы дзеяльнасьці пэпээсаўскіх баёвак. Гэтак з прычыны паляваньня, быў нядаўна забіты пэпээсаўскай баёўкай насільшчык Любэльскі. Пазьней забіты работнік Гловінскі, а пасьля яго Сечко, які прыймаў у свой час учасьце ў пэпээсаўскіх баёўках на 1 мая. Дзіўны спосаб пашырэньня сваей ідэалёгіі—пры дапамозе рэвальвэраў і палак — выбралі сабе П(аслушныя) П(акорныя) С(лугі).

„Польска-нямецкая газэта“ ў Варшаве.

Газэты пішуць, што ў Варшаве ў хуткім часе мае наладзіцца вялікая польская газэта, якая мае падтрымліваць і разьвіваць думку аб гаспадарчым і палітычным збліжэньні Польшчы з Нямеччынай. Быццам усё ўжо ёсьць — і грошы і пісакі. — Няма толькі драбязы: „выдатнае асабістасьці“, якая станула-б на чале газэты, як яе галоўны рэдактар...

Мы ведаем, як Польшча Пілсудскага хоча гэтага збліжэньня з Нямеччынай, якое —гэтулькі карысьці ўжо дало, напрыклад, Францыі. Хоча гэтага для Польшчы — і сам Чэмбэрлен... Але, нажаль, толькі вось Нямеччына ня хоча гэтага, пакуль... пакуль — ня будуць перагледжаны яе ўсходнія граніцы!

Процi палітыканцтва духавенства.

Сярод вышэйшых касьцельных уладаў узьнялася думка забараніць ксяндзом прымаць чыннае ўчасьце ў палітычным жыцьці.

Ну, не бяда: ня будуць ксяндзы паслямі, дык яшчэ лепш працавацімуць... праз амбону й канфэсіянал!..

Заграніцай.

Трэці замах на Мусоліні.

На італьянскага дыктатара Мусоліні зроблены новы, ужо трэці, замах. Замах зроблены ў м. Болёньі на вагзале, калі Мусоліні пакідаў места пасьля свайго ўчасьця ў розных ваенных і „навуковых“ урачыстасьцях. Замаховец, праравўшыся праз паліцэйскі кардон, кінуўся на дыктатара і выстраліў у яго з рэвальвэру, але куля толькі сьлізнула па нейкаму ордэну, парвала пальто ды ўбілася ў аўтамабіль. Азьвярэўшая таўпа „народу“ (пэўна-ж фашыстаўскіх шпікоў ды міліцыянтаў!) у адну мінуту разарвала замахоўца ў кускі. Калі пасьля доктар пачаў аглядаць трупа, дык знайшоў на гэтых кавалках апрача ўсяго іншага—14 ран, зробленых кінжаламі, якія носіць якраз „міліцыя“. Замаховец аказаўся хлапцом 15 гадоў, сынам ведамага кніжнага выдаўца ў Болёньі — Цамоні. Калі бацька прыйшоў паглядзець на забітага, дык толькі па абрыўках вопраткі здалеў пазнаць сына.

Ацалелы дыктатар з трыумфам паехаў далей.

„Сьвяткаваньне“ ацаленьня Мусоліні.

Зараз-жа пасьля шчасьлівага замаху, які фашысты тлумачаць „змовай камуністаў і сацыялістаў“, пачалося „сьвяткаваньне“ ацаленьня Мусоліні па ўсей Італіі. У тую-ж ноч быў адданы загад аб мабілізацыі ў Рыме ўсей фашыстаўскай міліцыі. У Мілане фашысты разграмілі рэдакцыі сацыялістычных і камуністычных газэт. Цяжка зьбіты там-жа павадыр сацыялістаў Валестры. Гэткія-ж гвалты пачаліся і ў іншых местах.

Новыя пагрозы Кука.

На адным з мітынгаў у Лівэрпулі павадыр бастуючых вуглякопаў Кук заявіў, што, калі вуглякопы голадам ды гвалтам будуць змушаны вярнуцца да працы на варунках, прадыктаваных прамыслоўцамі, дык яны пачнуць сабатаваць працу, псаваць прылады ў шахтах, дый наагул — рабіць больш шкоды, як карысьці ўласьнікам капальняў.

Немцы ў Лізе Народаў.

Генаральны Сэкрэтар Лігі Народаў англіец Друмонд назначыў сваім заступнікам—пэўна-ж у паразуменьні з вялікімі дзяржавамі!—немца.

Халодныя адносіны між Францыяй і Італіяй.

Ведама, што зачэпная і заборчая палітыка Мусоліні, які зусім ня крые ў сваіх прамовах, што ня можа дачакацца, калі ўжо прыдзе нарэшце час дзяліць „францускую спадчыну“ ў калёніях, — страшэнна абурае публічную апінію Францыі. Аднак Пуанкарэ зусім не жадае выклікаць канфлікту з Італіяй, якая быць можа і хацела-б справакаваць яго... Тады Мусоліні хапіўся іншай тактыкі. Ен выразіў—праз свайго пасла ў Парыжу—пажаданьне заключыць з Францыяй асобную ўмову—у справе падзелу ўплываў у Сяродземным моры і ў справе калёніяў. Адначасна італьянская дыпляматыя пускае ў рух сэнсацыйную вестку аб тым, быццам Францыя маніцца ўступіць Італіі свой „мандат у Сірыі“. Вестку гэтую падтрымлівае і англійская прэса, бо Мусоліні, як ведама, нядаўна меў тайнае паразуменьне з Чэмбэрленам. Урэшце, Мусоліні праз пасла выразіў пажаданьне спаткацца асабіста з Брыянам, каб паразумецца ў-ва ўсіх парушаных справах.

Але на ўсе гэтыя заходы ды забегі францускі ўрад адказаў коратка, але ясна: асабістае спатканьне з Мусоліні Брыяну непатрэбна; справа аб аформленьні якімсь дагаворам запраўды-ж „няясных“ францускаітальянскіх адносінаў пакуль яшчэ... — не дасьпела. Аб падзеле Сяродземнага мора ня можна ўмаўляцца бяз Англіі і Гішпаніі. Што датычыць весткі аб Сірыі, дык яе нявярта навет запярэчываць...

Ужо з гэтых размоваў відаць, якія напружаныя адносіны зложыліся між Францыяй і Італіяй. Ясна і тое, што Італія будзе і надалей зачапляць ды правакаваць Францыю, маючы ўсё мацнеючы апэтыт на яе калёніі...

Амэрыканска-англійска-нямецкая фінансавая дыктатура.

Старшыня Нямецкага Дзяржаўнага Банку Шахт мае ў канцы году паехаць у Амэрыку—на нараду з дырэктарам Амэрыканскага Фэдэральнага Банку. У гэтай нарадзе маюць прыняць учасьце і міністар фінансаў Амэрыкі і цэлы рад найбуйнейшых яе фінансістаў. Мае ў той самы час — „на Сьвята“— прыехаць да Нью-Іорку і дырэктар Англійскага Банку... Усе гэтыя паны і маюць апрацаваць меры і спосабы, як адратаваць Эўропу ад заняпаду...

Паразуменьне чэхаў з славакамі.

Пасьля палітычна мудрага паразуменьня чэхаў з немцамі, вынікам якога, з аднаго боку, зьявілася спыненьне варожага проціддзяржаўнага становішча нямецкай меншасьці, а—з другога—уваход 2 міністраў-немцаў у склад чэскага ўраду,—прэм'ер Чэха-Славацкай Рэспублікі Швэгля пачаў шукаць кампрамісу і з народам славацкім, які номінальна лічыцца такім-жа „дзяржаўным гаспадаром“ Рэспублікі, як і народ чэскі. У справе паразуменьня з славакамі адбылося некалькі нарадаў прэм'ера з правадырамі славацкага клюбу ў чэскім сойме, на чале з п. Глінкай.

Першая рата Гогэнцолернам.

Прускі ўрад палажыў 1 лістапада ў банк на імя паўнамоцніка дынастыі Гогэнцолернаў 15 мільёнаў марак, як першую рату адшкадаваньня—на падставе новапрынятага закону.

Справа Віленшчыны.

Ізноў справа Віленшчыны.

Англійскія газэты пішуць, што англійскія ўрадавыя колы лічаць абмылкай пастанову Рады Амбасадораў, пацьвярдзіўшую „аканчальнасьць“ польска-літоўскай граніцы і прыналежнасьці Віленшчыны да Польшчы..· Англійскі ўрад, піша „Дэлі Тэлеграф“, ня можа згадзіцца на дамаганьні Польшчы і іншых дзярж (чыт·: Францыі!) — „утапіць“ літоўскі ўрад за яго дамаганьне Віленшчыны.—Бо-ж, калі, пры новым магчымым пераглядзе польска-нямецкай граніцы, Польшча, напрыклад, атрымала-б... выхад да мора праз Клайпэду замест Гданску, дык ясна-ж, што Польшча тады павінна была-б выстарацца на гэтую замену згоду Літвы, а за яе пэўна-ж павінна была-б заплаціць Літве Віленшчынай...

Літоўскі прэм'ер—аб пастанове Рады Паслоў.

Літоўскі прэм. Сьляжэвічыус заявіў у камісіі для заграгнічных спраў Сойму, што Рада Паслоў ня мае ніякага права рабіць „пастановы“ ў справе Віленшчыны, бо ніводная міжнародавая ўмова не дае ёй на гэта права.

У канцы прамовы міністар дадаў, што, пакуль справа Віленшчыны ня будзе вырашана на падставе права і справядлівасьці, датуль між Літвой і Польшчай ніякіх нармальных адносінаў быць ня можа. Дык, маючы на мэце ўласную карысьць, ды карысьць усяе Эўропы, літоўскі ўрад рад будзе прывітаць кожны пачын мірнага перагляду віленскага пытаньня.

Гэтую заяву трэба злучыць з тэй акцыяй, якая паднялася ў англійскай прэсе — якраз за перагляд віленскай праблемы. Ясна, што ў тымжа напрамку націскае на марш. Пілсудскага і вельмі ўплывовы наагул у Варшаве — англійскі пасол Макс-Мюлер.

І ад „вызваленцаў“ вызваляюцца!

Я ніжэй падпісаны, Мірон Курчыцкі, — былы сябра партыі „Вызваленьня“, пераканаўся, што „Вызваленьне“—гэта партыя ашуканская, што яна стаіць за тое, што, — калі парцэляваць зямляю,—то з выкупам, ды яшчэ за вялікія грошы для абшарнікаў, што яна стаіць за польскае асадніцтва на нашыя беларускія землі—і ня толькі вайсковае, але цяпер і цывільнае; што яна ані адным словам не запратэставала проці самаволі і зьдзекаў над намі—беларусамі, ды проці гвалтаў над палітычнымі вязьнямі—там у каморках, далёка ад людзкага вока; што „Вызваленьне“—гэта парабак буржуазіі.

Кроў і сінякі нашыя — на іх сумленьні!

Дзеля гэтага я выходжу з „Вызваленьня“ і ўступаю ў Белар· Сял.-Раб. Грамаду, якая паможа нам выбіцца з тае нуды, у якой мы цяпер мадзеем,—якая запраўды дамагаецца таго, што выставіла ў сваей праграме.

Хай усе чэсныя „Вызваленцы“ тое самае зробяць!

Няхай жыве Белар. Сял.-Раб. Грамада!

Мірон Курчыцкі.

(М. Турэц, Ярэміцкай гм., Наваградзк. пав·).

Ратаваньне капіталізму.

У апошнім нумару нашае газэты мы зьмясьцілі „Маніфэст Капіталу“, міма якога нельга прайсьці моўчкі дзеля таго, што ён выяўляе вельмі цікаўнае і важнае для працоўных зьявішча ў гаспадарчым жыцьці сьвету. На гэтым зьявішчы мы і хочам сяньня супыніцца.

Здаецца, ніхто ўжо ня будзе спрачацца аб тым, што так-званы капіталістычны лад на ўсім сьвеце перажывае цяжкі крызіс. І мы перакананы, што гэты крызіс раней ці пазьней мусіць яго давясьці да поўнага банкруцтва. А прычыны гэтага няўхільнага банкруцтва і сьмерці гаспадарчага ладу, абапертага тым на прыватныя асобы, якія заўладалі капіталамі і спосабамі вытворчасьці, крыюцца ў самай істоце капіталізму.

За апошнія сто гадоў капіталізм адыграў нязвычайна выдатную ролю ў сусьветным эканамічным жыцьці. Ён выклікаў магутны рост прамысловае вытворчасьці. Ён напхнуў думку чалавека да вынаходу ўсё лепшых тэхнічных спосабаў і прыладаў вытворчасьці. Ен даў магчымасьць стварыць вялізарныя фабрыкі і заводы, дзе згуртаваліся вялікія масы работнікаў—тая жывая сіла, якая сваімі рукамі кіруе машынамі і творыць усялякае багацьце на сьвеце.

У руках невялікае жмені людзей, якія зьяўляюцца ўласьнікамі фабрык, заводаў і машын, пры гэтым расьлі вялізарныя капіталы, якія тварыліся затым, што работнікі за сваю працу атрымлівалі і атрымліваюць адно гэтулькі, каб мелі магчымасьць не памерці з голаду і працаваць,—а вартасьць таго, што яны выраблі, у колькі разоў перавышае атрыманую заработную плату. Гэтак коштам недаяданьня і мадзеньня міліёнаў працоўных багацелі і багацеюць адзінкі... Але капіталы, якія зьбіраюцца ў руках невялікае лічбы фабрыкантаў, усялякага роду прадпрыемцаў і купцоў, не ляжаць бяз руху: інакш адно-два пакаленьні праелі-бы іх, не пакінуўшы нічога. Не: капіталы йдуць далей у ход, за іх закладаюцца новыя фабрыкі і прамысловыя прадпрыемствы, якія вытвараюць масу новых тавараў—на продаж людзям.

Але-ж бяда у тым, што рынак — лічба пакупцоў на гэныя тавары — ў кожным краі абмяжованая: народ нарастае павальней, чым зьвялічваецца вытворчасьць прамысловасьці. Дык вытворцы шукаюць збыту для сваіх тавараў у другіх краёх — з бяднейшай прамысловасьцяй,—шукаюць іх у краінах з ніжэйшай культурай,—за акіянамі, сярод напалову йшчэ дзікіх людзей. За гэтыя рынкі збыту так сама, як і за землі, дзе можна даставаць неабходнае для фабрык сыр'ё, паміж дзяржавамі ўзьнімаюцца крывавыя войны,—і ў апошняй сусьветнай вайне іменна гэтая канкурэнцыя паміж вялікімі прамысловымі гаспадарствамі аказалася прычынай праліцьця крыві міліёнаў людзей. Галоўнымі канкурэнтамі былі: Англія, Нямеччына, Францыя, Італія, ды вялікія заакіянскія дзяржавы, як Амэрыка і Японія.

За час вайны, калі ўсе гэтыя волаты блізу ўсю сваю прамысловасьць датарнавалі да ваенных патрэб, вытвараючы—замест тавараў мірнага часу—ваенныя матэрыялы, — у тых краінах, якія служылі раней месцам збыту для іхніх тавараў, пачала тварыцца і расьцьвітаць свая ўласная прамысловасьць. Так сталася ў цэлым радзе падлягаючых Англіі заморскіх зямель—так-званых доміініях і калёніях; тое-ж бачым і ў калёніях Францыі і г. д. Дый у Эўропе ў выніку вайны ўтварыўся цэлы рад новых малых гаспадарстваў (Польшча, Літва, Латвія, Фінляндыя, Вэнгрыя, Чэхаславакія), якія будуюць уласную прамысловасьць і ня хочуць браць чужых тавараў, стараючыся ўсё патрэбнае ватвараць у сябе дома. Урэшце, насяленьне тых дзяржаў, якія прымалі ўчасьце ў вайне (апрача, здаецца, аднае толькі Амэрыкі), страшэнна абяднела, і народныя масы шмат менш могуць купляць выраба́ў сваей-жа прамысловасьці, чым да вайны. У выніку гэтага старая прамысловасьць ня мае магчымасьці адбудавацца пасьля ваеннага пэрыяду ў старых сваіх межах, бо зьменшыўся попыт на яе вырабы.

Вось чаму чужыя капіталы, ня маючы для сябе прылажэньня дома, прупца і ў Польшчу, і у Літву, і ў Латвію і г. д.;—вось чаму яны, хоць і бачаць усю пагрозу для капіталізму, якая йдзе з Радавага Саюзу, усё-ж гатовы ісьці і туды, каб знайсьці для сябе ход. Але й гэта не ратуе інтарэсаў валадароў гэтых капіталаў: яны ведаюць, што новастворыныя дробныя гаспадарствы з маладой прамысловасьцяй будуць рукамі і нагамі бараніцца ад паняволеньня іх чужым капіталам. Дык ізноў перад намі ўзьнімаецца пагроза аружнае барацьбы вялікіх дзяржаў з малымі—за эканамічнае панаваньне над апошнімі.

„Маніфэст Капіталу“ і прадстаўляе спробу знайсьці супольнымі сіламі выхад з утварыўшагася палажэньня. Капіталісты хочуць наладзіць як-быццам адну супольную прамысловую гаспадарку і так пакіраваць прамысловасьцяй маладых дзяржаў, каб яна ім не замінала. Утвораны нядаўна „сталёвы трэст“ найлепш паказуе, якую нікчэмную ролю ў мэталёвай прамысловасьці вызначаюць вялікія капіталы новастворыным дзяржавам...

Але ратаваньне капіталістычнага ладу гэтым шляхам,—зусім правільным, калі справа йдзе аб стварэньне міжнародавага—сусьветнага — кіраўніцтва ўсім прамысловым жыцьцём!—не абмяжоўвуецца толькі нармаваньнем прамысловасьці паадзінокіх сяброў праектаванага міжнародавага гаспадарчага саюзу: прадстаўнікі капіталу, рупячыся выключна аб свае вузка-эгаістычныя інтарэсы, хочуць у гэты цяжкі для іх час перакласьці ўвесь цяжар ратаваньня капіталістычнае прамысловасьці — на работніцкія масы. І вось у-ва ўсіх дзяржавах Эўропы мы бачым імкненьне да зьмяншэньня заработкаў работнікаў і павялічэньня часу працы. Найярчэйшым прыкладам гэтага імкненьня зьяўляецца тая барацьба, якую ўжо паўгоду—шляхам агульнае забастоўкі — вядуць у Англіі капальняныя работнікі („гарнякі“).

Гаворачы аб тым, што „інтэрнацыяналізацыя“ прамысловасьці па сваей ідэі зьяўляецца правільнай, мы павінны адзначыць, што ўсё-ж яна ня можа дасягнуць сваей мэты, пакуль у аснове яе будуць ляжаць інтарэсы абмяжованае лічбы капіталістаў, а не працоўных. Імкненьне на падставе міжнародавага паразуменьня абрэзываць заробкі працоўных, каб гэткім чынам утрымаць заробкі капіталістаў на старой вышыні, выкліча вострыя адпор работнікаў усіх краёў і толькі ўзмацуе іх салідарнасьць. Сацыяльная барацьба толькі ўзгарыцца больш яркім полымем, і мамэнт перамогі працоўных, хаця і цаной цяжкіх ахвяр, мусіць толькі аказацца прысьпешаным. А прыклад Радавага Саюзу, дзе іменна на шляху аб'яднаньня кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём на вялізарных прасторах адбудоўваецца зруйнаваная прамысловасьць, але не на карысьць зьнішчаных там капіталістаў, а ў імя інтарэсаў работнікаў, — дадасьць працоўным усяго сьвету веры ў перамогу і энэргіі дзеля змаганьня.

Н. Фалькевіч.

З жыцьця „Грамады“.

Проці незаконных рэпрэсіяў.

Да ведама Цэнтральнага Сэкрэтарыяту даходзяць бесперастанныя скаргі на тое, што ўлады першае інстанцыі ў асобах Павятовых Старастаў сыстэматычна забараняюць рабіць сабраньні Гуртком нашае легальна істнуючае палітычнае партыі Сялянска-Работніцкае Грамады. Забароны чыняць амаль ня ўсе Старасты, але асаблівым бічом для легальнае працы зьяўляюцца Старасты Маладэчанскі, Слонімскі, Дзісенскі, Пастаўскі, Навагрaдзкі, Пінскі і інш. Паліцыя сачыць за кожным крокам Камітэтаў Гурткоў, піша даносы Староствам, а Староствы рассылаюць павесткі і выклікаюць людзей за 30—40 вёрст у Староства для „збаданьня“ ў справе сабраньняў, ды часта страшаць найвышэйшымі карамі. Вышэй паданыя Староствы ўжо пакаралі шмат сяброў Грамады найвышэйшымі карамі адміністрацыйным парадкам і часта пакараных адразу запакавалі пад арышт на розныя тэрміны. Гэта адчулі ўсе Камітэты Гурткоў Грамады, Камітэты Павятовыя і давераныя асобы Грамады.

Проці гэтых гвалтаў зараз-жа неабходна падняць пратэст. Неабходна падняць голас у абарону сваіх правоў, заварантаваных нам, беларусам, Канстытуцыяй і Вэрсальскім і Рыжскім Трактатамі.

Свабода слова, свабода сабраньнаў, свабода друку і жыцьцёвых нарад гарантаваны кожнаму з нас (арт. 109 канстытуцыі). Трэба карыстацца сваімі правамі і дабівацца права рабіць тое, што робяць іншыя легальныя палітычныя партыі: Вызваленьне, П. П. С., Х.-Д. і Хіена.

Проці гвалту павінен пратэставаць кожны пакрыўджаны, калі жадае лепшае будучыні; дзеля гэтага ўсе Камітэты Гурткоў Грамады зараз-жа павінны напісаць лісты пратэсту проці гэтага беззаконьня крэсавых уладаў адносна да забароны сходаў. Лісты трэба пісаць, як хто можа, на імя Маршалка Пілсудскага, як Прэм‘ера, і на імя Міністраў Унутраных Спраў і Справядлівасьці. Лісты трэба пісаць у двох экзэмплярах, у якіх пад тэкстам пратэсту сабраць як найбольш подпісаў усіх сяброў і не сяброў Грамады, мужчын і кабет, і ўжо падпісаныя пратэсты (абодва экзэмпляры) перасылаць у Цэнтральны Сэкрэтарыят Грамады: *Wilno, Wielka ul. 30—9.* Усе, як адзін, павінны падпісаць пратэсты.

Не грамадзіст той, хто зараз-жа не падпіша пратэсту ў абарону сваіх правоў!

Цэнтральны Сэкрэтарыят.

I. XI—1926 г.

Да ведама грамадзістаў м. Вільні.

У нядзелю 7-га лістапада с. г. ў 12 гадз. дня пры Вялікай вул. № 30 кв. 9 адбудзецца **агульны сход сяброў усіх віленскіх гурткоў** Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады.

Яўка ўсіх абавязкава. **Камітэт.**

Павятовы Зьезд у Беластоку.

У нядзелю 14-га лістапада ў 10 гадз. раніцай у Беластоку ў памешканьні тэатру „Палас“ (ul. Kilinskiego № 6) адбудзецца Павятовы Зьезд сяброў Беластоцкага павету.

На зьезьдзе абавязкава прысутнасьць Камітэтаў Гурткоў, давераных асоб і ўсіх сяброў Грамады Беласточчыны. **Цэнтр. Сэкрэт.**

Паведамленьне.

Згодна з пратаколам за № 3 ад 1-га лістапада 1926 г. Сточкаўскага гуртка ў Белавежскай гм., Бельскага пав., выключаецца з ліку сяброў Грамады грам. Паўла Рамановіч і ўнеВажняецца яго білет за № 237.

Па атрыманым весткам вышэйўспомнены грам. вядзе яўна шкадлівую працу, скіраваную да разьбіцьця Грамады. Цэнтральны Сэкрэтарыят зацьвярджаець пастанову гуртка, клічучы разам са Сточкаўскімі сябрамі: „Няма мейсца ў Грамадзе здраднікам працоўных“.

У гуртках.

✕ З дазволу старосты 26./IX. г. г. ў в. Юшкавічах, Мядзельскай гм., Пастаўскага пав. адбыўся сход тамашняга гуртка „Грамады“. На сходзе было каля 100 асоб. Усе былі або з партыйнымі білетамі, або па запросінах. У 12 гадзіне прыехаў мядзельскі камандант з паліцыянтам і хацеў быць на сходзе, але партыйная міліцыя ня пусьціла яго, бо ён ня меў ані партыйнага білета, ані запросінаў. Камандант тлумачыцца, што ён мае права, бо староста тэлефонаграмай загадаў яму быць на сходзе. Міліцыя кажа: „Пакажы тэлефонаграму“. Камандант паясьняе, што забыўся ў дома. Але ўсёроўна ня пусьцілі яго на сход. Камандант мусіў паслаць па тэлефонаграму паліцыянта конна за 10 вёрст у Мядзел, а сам пад вакном стаяў, у хату ня пусьцілі. Пакуль паліцыянт прыехаў з тэлефонаграмай,—сход скончыўся і без паліцыі. На сходзе прынялі адпаведныя рэзалюцыі і закончылі пяяньнем „Ад веку мы спалі“... Камандант быў злы,—кажа: „Калі вы мяне ня пусьцілі на сход, то я сумею вам гэта прыпомніць“.

✕ Жураўнеўскі гурток „Грамады“, Рыбацкай гм., Дзісьненскага пав., расьце. На першым сходзе было толькі 8 чалавек, а на другім у пяць разоў больш! Расьце ў Дзісеншчыне „Грамада“, ня глецзячы на лаянку буржуазіі і слугаў яе. А як лаюць там „Грамаду“ і страшаць сялян! Лае і страшыць абшарнік Акушка з двара Канстантынава, Верхнянскай гм., лае і страшыць ксёндз, ды так лае, аж амбона трашчыць! Лаяў „Грамаду“, як быў там, і ваявода Рачкевіч. Але народ у адказ на гэта творыць без перастанку сталёвыя кадры „Грамады“.

✕ 19./IX. адбыўся сход сяброў нашага гуртка в. Ярашова, Маўчадзкае гм., Баранавіцкага пав. Ідучы за радай Цэнтральнага Сэкрэтарыяту, за 5 дзён да сходу мы паведамілі Старасту Баранавіцкага пав., бо мяйсцовая паліцыя ў м-ку Моўчадзі паведамленьні аб сходках прыймаць адмовілася. На сходзе было 30 асоб прысутных: апрача сваіх сялян, прыйшлі правадыры і сябры гурткоў з вакалічных вёсак. Паліцыі ня было. З прамовай выступіў старшыня К. Галубовіч, які нарысаваў перад прысутнымі сумныя абразкі з розных галін нашага гаротнага жыцьця. Пасьля адзін за адным пачалі выступаць з прамовамі паасобныя сябры: гаварылі аб зьдзеках паліцыі, аб школе, аб падатках, аб страшэннай эксплёатацыі бедных сялян абшарнікамі і г. д. Асаблівую ўвагу зьвярнулі сабраўшыяся на поўную адсутнасьць у нас беларускіх школ. Сяляне нашай школьнай вокругі (3 вёскі) ўжо пры помачы гуртка запоўнілі дэкларацыі на ўрадовую беларускую школу, падгатаўляючы адначасна грунт да адчыненьня прыватнае школы.

У канцы прысутныя на сходзе пастанавілі:

а) Бароцца з страшэннай эксплёатацыяй бедных сялян абшарнікамі, а перадусім энэргічна працаваць у напрамку асьведамленьня сялян акалічных вёсак і падгатаўленьня сярод іх партыйных работнікаў, (запісана 8 вёсак, для працы ў якіх выдзелена па некалькі сяброў).

б) Агітаваць за сваю родную беларускую школу, памагчы сялянам у складаньні дэкларацыяў на ўрадовую беларускую школу і тлумачыць, як можна адчыніць прыватныя школы.

в) Дзеля таго, што ў некаторых вёсках Баранавіцкага пав., зьяўляюцца ППС і вядуць сваю здрадніцкую работу, тлумачыць сялянам, што ППС — здраднікі інтарэсаў сялян і работнікаў і што працуюць яны выключна на карысьць польскае дэфэнзывы.

Гэтак выглядае першы сход нашага гуртка Б.С.Р.Г. Не магу не падчыркнуць, што сьведамасьць сярод сялян-беларусаў расьце з кожным днём усё больш і больш. Нацыянальнае прабуджэньне беларусаў, змаганьне за свае правы — родзіць у душы цьвёрдую веру, што мы станем хутка на парозе лепшае будучыні. **Ярашэвіч.**

✕ Змагар за народную беларускую справу Аляксандар Дзембіцкі, сябра „Грамады“ з в. Масалян, Горадзенскага пав., ня мае ані хаты, ані пядзі зямлі і служыць электратэхнікам у Бісьпінга. Як ні страшылі яго панскія сабакі, што калі ён запішацца ў „Грамаду“, то Бісьпінг прагоне яго, — ён усё-ж-ткі запісаўся і, дзякуючы яго працы, у Масалянскім гуртку стала 40 сяброў (з шасьці); у в. Рымуцёўцах ён таксама з‘арганізаваў гурток, ды пашыраў працу і на другія вёскі. Данясьлі шпікі аб гэтым Бісьпінгу. Прыходзіць раз Бісьпінг у бровар, дзе служыў Дзембіцкі, і застае Дзембіцкага чытаючы „Народную Справу“. Тут-та гэты душагуб, бандыт і падпальшчык накінуўся на Дзембіцкага: „Won, psia krew, białorusie-bolszewiku!“. А Дзембіцкі адрэзаў: „З голаду без цябе не памру, — зараз прыдзе пара, што мае будзе права!“ — і пайшоў. Застаўся ён бяз куска хлеба і без страхі над галавою для сям‘і: жонкі і дзяцей.

Масалянскі гурток заклікае ўсіх грамадзістаў памагчы гэтаму змагару, і самы масалянцы даюць першы прыклад ахвярнасьці.

Трэба паказаць на дзеле, што мы запраўды можам стаць усе за аднаго, бо толькі тады не загінем і будзем моцнымі і фізычнай і духовай сілай, ды пераможам ворага!

Школьныя справы.

Надужыцьці пры складаньні школьных дэкларацыяў.

Косаўскі павет. Войт Ражанскае гміны 18 кастрычніка 1926 г. адмовіў сьведчыць подпісы на дэкларацыях сялянам вёскі Варанілаўцы, вымагаючы мэтрыкі аб нараджэньні на каждае дзіця і кажучы, што ён ня мае адпаведнага распараджэньня ў гэтай справе ад Косаўскага староства.

Войт Сьвята-Вольскай гміны адмовіў сьведчыць подпісы дэклярантаў вёскі Малая-Гаць, вымагаючы мэтрык аб нараджэньні дзяцей.

Войт Тэлеханскае гміны 8 кастрычніка 1926 г. замест таго, каб пасьведчыць подпісы на дэкларацыях сялянам вёскі Гартань, забраў гэныя дэкларацыі, пагражаючы сялянам турмою і наагул стараўся ўсялякімі пагрозамі запалохаць дэклярантаў. Гэты самы войт адмовіў сьведчыць подпісы дэклярантам вёскі Рэчак.

Пружанскі пав. Войт Сухопальскае гміны адмовіў сьведчыць подпісы на дэкларацыях сялянам вёскі Ялова.

Слонімскі пав. Войт Міжавіцкае гміны не пасьведчыў подпісаў дэклярантаў вёскі Юхнавічы, кажучы, што ён беларускіх школ не прызнае, а сьведчыць подпісы толькі на польскую школу.

Нясьвіжскі пав. Войт Гарадзейскае гміны Сакалоўскі катэгарычна адмаўляе наагул сьведчыць подпісы сялян на дэкларацыях, кажучы, што няхай сьведчыць той, хто даў гэныя дэкларацыі і ўсякімі іншымі спосабамі стараецца ня сьведчыць подпісаў.

Пінскі павет. Войт Марочанскае гміны Іван Малайчук адмаўляе сьведчыць подпісы дэклярантаў, тлумачачы тым, што ня ўправе гэта рабіць, бо мае ў гэтай справе адпаведнае распараджэньне, якога і мусіць прытрымлівацца.

Навагрaдзкі павет. Войт Карэліцкае гм. Лагута Астап адмовіў сьведчыць подпісы на дэкларацыях сялянам вёскі Забалоцьця. Калі-ж сяляне пачалі настойна дамагацца пасьведчаньня подпісаў і паказалі інструкцыю, дык войт адказаў, што ніякіх інструкцыяў у беларускай мове ён не прызнае.

Маладэчанскі павет. Войт Палачанскае гміны Леган Міхал не пасьведчыў подпісаў на дэкларацыях сялянам вёскі Літвы, тлумачачы тым, што ён мае распараджэньне ад Маладэчанскага старосты аб тым, каб ня сьведчыць подпісаў на дэкларацыях.

Пастаўскі павет. Войт Манькаўскай гміны адмовіў сьведчыць подпісы дэклярантаў вёскі Русіны, кажучы, што ён ня мае на гэта права.

Войт Мядзельскае гміны Багдановіч ня сьведчыць подпісаў на дэкларацыях сялянам вёскі Гулі, кажучы, што ён мае ў гэтай справе адпаведнае распараджэньне ад старосты, якога ў гэтым выпадку і прытрымліваецца.

Горадзенскі павет. Бурмістр м-ка Скідля Рамановіч вымагаў платы ў ліку 1 злотага за пасьведчаньне подпісу на кожнай дэкларацыі, а пасьля і зусім адмовіў сьведчыць подпісы дэклярантаў м-ка Скідля.

Грамадзяне! Настойна дамагайцеся, каб войты сьведчылі подпісы на дэкларацыях, бо дэкларацыі можна складаць толькі да 31 сьнежня.

ХРОНІКА.

Яшчэ адзін юбілей. Да сёлетніх юбілеяў далучаецца літэратурны юбілей—20-леце паэтычнае працы Якуба Коласа, які распачаў друк сваіх твораў у „Нашай Долі“. У Менску рыхтуецца ўрачысты абход. Віленскае беларускае грамадзянства павінна адгукнуцца таксама!

Да акадэмічнае канфэрэнцыі ў Менску. Акаддэмічная Канфэрэнцыя, якую склікае ў Менску Інстытут Беларускае Культуры ў справе рэформы беларускага правапісу і шрыфту, вызначана на 14 лістапада і мае працягнуцца тры дні. З прычыны таго, што гэты час—дужа недагодны для нашых культурных дзеячоў у межах Заходняе Беларусі, Беларускае Навуковае Т-ва ў Вільні запрапанавала Інбелкульту адлажыць Канфэрэнцыю на калядны час.

На жаль, адклад аказаўся для арганізатараў немагчымым, і ў адказ на пісьмо Бел. Навук. Т-ва прыйшла ў Вільню 2-га лістапада тэлеграма, што Канфэрэнцыя адбудзецца ў пачаткова назначаным часе — 14 лістапада. Такім чынам ня ўсе запрошаныя асобы здолеюць на гэты час паехаць у Менск.

Ведама, падарожа ў Менск будзе наагул залежаць ад таго, ці польская ўлада дасьць пашпарты на выезд—на льготных варунках, як гэта прадугледжана законам для падарожаў ў навуковых мэтах. Гэтымі днямі пытаньне гэтае будзе выясьнена.

З працы Т-ва Беларускае Школы. Праца Т-ва на правінцыі за апошні час значна пашырылася. Аб гэтым сьведчыць адчыненьне Акруговае Управы Т-ва ў Навагрaдку, якое адбылося ў мінулую нядзелю, 31 кастр.

Дзеля арганізацыі Акруговае Управы сабраліся ў Навагрaдку дэлегаты ад 30 гурткоў таварыства. На зьезьдзе быў зроблены цэлы рад дакладаў з мейсц, у якіх адзначаліся тыя перашкоды, якія беларуская культурная праца сустракае з боку польскае ўлады. Абгаворана была такжа справа падачы дэкларацыяў з дамаганьнем беларускіх урадавых школ, і справа арганізацыі прыватных школаў.

У склад Навагрaдзкае Акруговае Управы Т-ва Беларускае Школы былі выбраны: старшыня — грам. Чатырка, скарбнік — грам. Шумскі, сэкрэтар — грам. Алешкевіч.

Збор слоўнікавага матэрыялу. Абвешчаная Беларускім Навуковым Т-вам анкета ў справе зьбіраньня беларускіх слоў жывое мовы, з якіх будуць пасьля складзены раёнкыя слоўнікі беларускае мовы, пачынае даваць вынікі. На рукі ўраду Т-ва наплываюць матэрыялы, якія будуць усыстэматызаваны і перасланы дзеля друку ў Менск — у Інстытут Беларускае Культуры.

Трэба толькі, каб наша вясковая інтэлігенцыя і наагул усе граматныя людзі пасьпяшыліся з гэтай работай, каб яе закончыць перад Новым Годам.

Віленская чорная сотня проці Грамады. „Дзен. Віл.“ друкуе „Пісьмо“ раду віленскіх „патрыятычных“ арганізацыяў да віленскага ваяводы— з дамаганьнем, каб той прыняў рашучыя меры проці „камуністычнай акцыі“—„Грамады“ і „Незал. Партыі Хлопскай“. Віленскія арганізацыя жаляцца ваяводзе на тое, што ўрад „церпіць яўна процідзяржаўную працу“ гэтых партыяў і г. д...

Цікаўна, што гэтыя арганізацыі, трэбуючы ад прадстаўніка, ўлады выразнага гвалту над адкрыта легальна працуючай партыяй, якая ахоплівае ўжо амаль ня ўсё сьвядомае беларускае насяленьне краю, пазываецца... на прынцыпы „дэмакратызму“, паводле якога „ўрад павінен у сваіх пачынаньнях апірацца на... публічнай апініі“, ці — карацей: слухаць загадаў тых дабраных —„акадэмікаў“, „кабетаў“ ды „халерчыкаў“, якія падпісаліся пад гэтым лістом, ды—на гэтай падставе граміць запраўды-ж дэмакратычную масавую арганізацыю народу!...

Падпісаны пад лістом, аж 18 арганізацыяў, спаміж якіх — аж чатыры студэнцкія, адна жаноцкая, 2 — „довборчыкаў“ і г. д. Есьць нават і — гімнастычна-палітычная!

Не абыйшлося, зразумела, і без „саюзу крэсавых абшарнікаў“...

У Касе Хворых м. Вільні 3-га лістапада 1926 г. адбылося першае паседжаньне радных, якія прайшлі ў сёлешнім годзе да Касы Хворых. На паседжаньні было прыступлена да выбараў:—1)Прызыдыуму Рады, 2) Управы 3) Рэвізыйнай Камісіі; 4) Раз‘емчай Камісіі

Выбраны: У прэзыдыум Рады—старшыня д-р. Броковскі, яго заступнік — д-р. Гольдбурт. У Управу Касы Хворых ад працадаўцаў увайшлі 2, і 2 заступнікі, ад забясьпечаных гэткія нумары: № 2 (хадэцыя)—атрымаў 3 мандаты; № 5 (блёк-бундаўцы і Незалежн. Польскія Сацыялісты) 3 мандаты; № 4 (пэпэзсаўцы) — нічога; № 6 (Jedność Zw. Zaw.) — нічога.

У Камісію рэвізыйную выбраны ад забясьпечаных гэткія асобы: Бауман, Куран, Сіпнеўскі і Наркевіч; ад працадаўцаў выбраны— Грузьдзь і Абрамовіч.

У камісію разьемчую ад забясьпечаных: Мішура (яго заступнік Сэгаль) і Сухоцкі, (яго заступнік Бойко); і ад цэлай Рады выбраны Каган (яго заступнік — Вайнштэйн).

Рэдактар газэты „Таймс“ на польска-літоўскай граніцы. Мясцовыя газэты падалі цікаўную вестку, што ўздоўж граніцы з Літвой некалькі дзён хадзіў, у кампаніі з літоўскімі афіцэрамі, нейкі „асобнік“, які аказаўся рэдактарам ці карэспандэнтам вельмі ўплывовай (амаль не ўрадавай) англійскай газэты „Таймс“.

Мы ведаем, які ўплыў на палітыку ураду меюць у Англіі кіраўнікі яе вялікіх, а перад усім урадавых газэт. Дык з усяго відаць, што англійскія кіруючыя колы запраўды-ж выставілі на чаргу дня справу літоўска-польскую...

Надужыцьці і разгон так зван. „комітэту обыватэльского“. Некалькі гадоў ужо істнаваў у Вільні, як і ўсюды ў Польшчы, такзваны „комітэт обыватэльскі“. На гэты „камітэт“, зложаны пераважна з рознага роду прамыслоўцаў і гандляроў, — была ўзложана хіена-пяста-пэпэзсаўскімі ўрадамі задача барацьбы з дарагоўляй і ліхвярствам. Гэткім чынам крывадушная буржуазія, як заўсёды і ў-ва ўсім, даручыла „барацьбу з дарагоўляй“ якраз тым самым акулам-жываедам, якія гэтую дарагоўлю ды ліхву ствараюць... Скольки разоў мы чыталі ў мясцовых газэтах „сьпісак цэн на прадукты і тавары“, вызначаных гэтым „камітэтам“,—сьпісак, у якім цэны былі заўсёды значна вышэйшыя, чым фактычна істнуючыя на рынку! Але паном з „камітэту“ і гэтага аказалася яшчэ мала. Толькі што зробленая рэвізыя „дзелаводэтва“ гэнае ўстановы раскрыла ня толькі страшэнны хаос (бязладзьдзе) — у кнігах „камітэту“, але і цэлы рад важных надужыцьцяў яго сяброў... У выніку рэвізіі — „комітэт обыватэльскі“ папросту разагнаны, а некаторыя паны „обыватэлі“ дык нават пацягнуты да судовай адказнасьці. Толькі вось—хто-ж будзе судзіць гэтых „обыватэляў“? Так сама — „обыватэлі“...

Афіцыяльны курс грошы на 5-га лістапада. Даляр — 8 зл. 96 гр. Залаты рубель — 4 зл. 61 гр.

5. XI. на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,97. Зал. руб. 4,70. Чырвонец 45.

Карэспандэнцыі.

Нашыя „прыяцелі і дабрадзеі“.

(В. Ярашова Маўчадзкае гм., Баранавіцкага павету).

Гурток Б. С.—Р. Г. з‘арганізаваўся ў нашай вёсцы 7.VIII б. г. Нармальную працу яго ажно да 19.IX (ў гэты дзень адбыўся сход пасьля паведамленьня Старшыны) спыняла мяйсцовая паліцыя ў м. Моўчадзі: два разы насілі мы паведамленьні на пастарунак, аж як у першым, так і ў другім выпадку паліцыя адмовілася прыймаць іх і ладзіць сход забараніла, пагражаючы арыштамі. Камандант гэтага пастарунку зрабіўся нават „прыяцелем“ сялян і, жадаючы дабра ім, ня радзіў запісвацца ў Гурток. Пытаецца ён адзін раз у селяніна в. Ярашова С., ці запісаўся ён у арганізацыю?—а той адказвае, што пакульшто—не, але хоча запісацца, бо Б.С.—Р.Г.— партыя легальная. Тады Камандант вельмі абурыўся на С. і ядавіта заявіў: „pamiętajcie, że prezes Kółka Hromady Hołubowicz, w Jaroszewie wszystkich was zaprowadzi do więzienia“. На гэта С. паўтарыў, што Грамада працуе адкрыта і легальна. „My nie będziemy aresztować was za pracę legalną, ale—za nielegalną“— пастрашыў Камандант дзяржаўнае паліцыі. Тут застаецца толькі думаць, што пры помачы нашага вясковага шпіка-правакатара Язэпа Журка, які ў леташнім годзе пасадзіў 12 нявінных сялян у вастрог, Камандант пастарунку мае надзею знайсьці ў працы Гуртка нешта „нелегальнае“, а сяброў арыштаваць. Пабачым...

А вось і другое цікавае зьявішча: пакуль ня было Гуртка, дык ніхто ня думаў аб тым, што ў нашай школьнай вакрузе няма ніякая школы. Цяпер-жа, як толькі сяляне пры помачы сяброў пачалі запаўняць дэкларацыі на беларускую школу, дык сышчык Я. Журка са сваім памоцнікам Сямёнам Шэйнай сталі хадзіць па вёсках і намаўляць сялян, каб запісваліся на польскую школу. Але сяляне ўсюды адказвалі, што польскае школы ім ня трэба, што будуць яны дамагацца, каб была свая родная беларуская школа.

Гэтак „працуюць“ у нас нашыя „прыяцелі і дабрадзеі“. А сяляне рашылі „Грамадой“ змагацца са злом гэтых „добрадзеяў“ і перамогуць яго! Ярашэвіч.

Наш кіраўнік.

(Горадзеншчына).

У Верцялішскай гміне кіраўнік „паўшэхнае“ школы мала таго, што духова калечыць беларускіх дзетак, але яшчэ прымушае хрысьціцца па-каталіцку праваслаўных, кажучы пры гэтым, што такім чынам ён у хуткім часе, бо ў пару гадоў, апалячыць іх. — „Wyrobię z was prawdziwych warszawiaków“.

Эх панок, панок! вельмі цяжка гэта ўжо табе зрабіць,—пагляньць навокал, пратры свае акуляры і ўбачыш як беларус ужо будзіцца ад векавога сну, зьбівае цы путы няволі і духовае беднаты. Беларус зразумеў, што ў такіх школах, як твая, робяць нашых дзетак гноем, на якім вырастуць атручаныя здрадаю кветкі, дый наагул робяць з іх няздольных да ніякае культурнае творчае працы, грамадзкага жыцьця і т. п. Дзеля гэтага бацькі і надаюць школьныя дэклярацыі да школьнага інспэктара, на сваю родную школу, бо школа так цесна злучана з жыцьцём народу, што гэта—нешта суцэльнае і непадзельнае.

Нам, беларусам, патрэбна такая школа, каб выгадавала шчырых сыноў народу, а не адшчапенцаў і здраднікаў. Дык няхай гэты сучасны магутны кліч абляціць па ўсіх кутох нашае бацькаўшчыны, закліча ўсіх да дружнае працы — да змаганьня за родную школу, якая ўзгадуе нашых дзетак на сьвядомых грамадзян, паставіць наш народ на роўні з усімі перадавымі культурнейшымі народамі сьвету, зробіць гордым з свайго імя беларускага.

Молат.

Нам пішуць з вёскі што:

× Панскі падлізьнік, парабак Янка Бурак з в. Мойсічы, Маладэчанскай гм. і пав.,—той самы, які абакраў і давёў да руіны каапэратыў, а цяпер прадае сялянскія інтарэсы ў гміннай радзе і сойміку,—„Грамаду“ называе жыдоўскай арганізацыяй і розныя другія глупствы выдумлівае на яе. Ен-жа займаецца дэфэнзыўнай работай і правакацыяй. Так,—Мойсіцкі солтыс Андрэй Станкевіч перапісваў, па загаду гміны, сялян свае вёскі — хто якой нацыі. Усе праваслаўныя запісаліся беларусамі, а з 25 каталікоў толькі 4 запісаліся палякамі, рэшта-ж — беларусамі. Тут-та і прычапіўся да солтыса Бурак: „Як ты сьмеў залічваць беларусамі?!“—Солтыс кажа: „Хто як хацеў, так я й запісваў“. Бурак ізноў да солтыса: „Пабачыш, — дастанеш месца, дзе Гадлеўскі“! Пасьля брахні Бурака, відаць па яго даносу, прыехалі два паліцыянты з Маладэчна і рабілі „бадане“: ці праўда, што „namawiał ludność“. Напісалі пратакол і паехалі.

Вось якія ў нас часамі вырастаюць „Буракі“!—Зусім выродкі!

× У ўрочышчы Остраў, Мірскай гм., Стаўпецкага п., жыве ведамы ўсім М. Жук, які самымі паганымі спосабамі змагаецца з „Грамадой“ ды кажа: „Напішу процідзяржаўную адозву, вывешу каля Гуртка „Грамады“, і няхай гурток адказвае!“ З агідай на яго глядзяць сяляне, кажучы: „Жук — дык і сумленьне мае жукаўскае і жыве духова, як жук, што ў горбах рыецца!“

× Марковіч,—солтыс з засьценку Новагоркі, Мірскай гм., Стаўпецкай пав., даведаўшыся, што „Грамада“ дамагаецца зьмяншэньня падатку бяднейшаму галавеку,— як ашалелы, бегаў і крычаў, абураючыся: як—то можна зьменшыць падаткі для „państwa“!

× Моцна спалі жыхары Цырына, Навагрудзкага пав., і ня чулі руху „Грамады“, а ў канцы-канцоў, убачыўшы, што толькі йдучы „Грамадой“ можна адваяваць свае правы і роўнае месца між усіх народаў, — прачхнуліся і шугнулі ў „Грамаду“.

× Банадыт Балаховіч, солтыс в. Брусы, Мядзельскай гм., Пастаўскага пав., брэша на „Грамаду“ і сялян, што запісваюцца ў яе. — Сяляне ня слухаюць яго, ды стыдам і ганьбай кляймяць яго.

× 6. IX. г. г. 17-гадовы Ліпа Бакунавіцкі, мясьнік з Слоніма, вёў быка на пашу на хутар „Дубіна“. На Ружанскай шасе яго спаткалі двое людзей і спыталіся: мусі ён быдлам таргуе; той адказаў „але“. Тады адзін з спаткаўшых схапіў Бакунавіцкага за горла, а другі прыставіў рэвольвэр да віска і кажа: „давай грошы“. Мясьнік згадзіўся аддаць усё, што мае; тады яго зволнілі. але, пакуль хлапец шукаў грошай, наехаў Вінцук Навіцкі, і бандыты ўцяклі! Пагоня паліцыі злавіла бандытаў, і аказалася, што абодва — вайсковыя асаднікі. У тую-ж ноч яны аграбілі жыда, што ехаў з Слоніма ў м. Косава, і цяжка ранілі з рэвольвэра ў жывот. Цяпер ранены ляжыць у Слоніме ў бальніцы.

× Зямля в. Запольле, Косаўскага пав., мяжуецца з зямлёю былага двара Удзельнага Ведамства. У 1912 годзе гэтую зямлю купіў Горадзенскі Сялянскі Зямельны Банк і, пабіўшы на хутары, прыступіў да прадажы зямлі мясцовым сялянам; але вайна перашкодзіла давясьці гэтую справу да канца. Цяпер гэтую зямлю забраў „жонд“ і насадзіў на яе польскіх асаднікаў.—Вось што выробляюць гэтыя асаднікі.

Раз на начлезе зыйшлі сялянскія коні на асадніцкую „дзялку“. — Асаднік Мерыжковскі заняў коні. Пайшлі сяляне па коні. Дык Мерыжковскі за коні ў Мікалая Міскі садраў кажух з плечаў, у Мікалая Кавалевіча—нагавіцы, а ў Тодара Югана—куртку. І пайшлі яны ў халодны васеньні ранак голымі да хаты.

× Пан Кардаш, што жыве ў Уласевіча ў в. Кошэлеве, Навагрудзк. пав., задаецца „drogomistrzem“ і затрымлівае людзей на публічных дарогах. Гэта было 5. VIII. г. г. з К. С., якога зацягнуў да старосты і там К. С. заплаціў 5 зл. кары за права „язды“. 20.IX.г.г. таксама хацеў гэты Кардаш затрымаць чалавека, што ехаў на веласіпедзе, але той уцёк.

× Дзіця Адама Гладкага з в. Гаравічы, Гарад. гм., ляжала ў Наваградку ў бальніцы, дык за гэта войт у гэтага Гладкага апошні кажух! І застаўся на зіму гэты Адам голы, як той прабацька наш райскі Адам.

× Колькі месяцаў назад селянін Жукоўскі ў в. Жукавічах, Паразоўск. гм. Ваўкавыскага пав., забіў сакерай жонку сваю і судзьдзю Ляшчынскага, злавіўшы іх у ляску на граху. Сярод паноў такія забойствы лічацца звычайнай і „ганаровай“ справай. Але „мужыка“—ды йшчэ за судзьдзю! — горадзенскі акружны суд засудзіў на 8 гадоў катаргі!

× Пры папраўцы соймікавай дарогі ў Іодзкай гм., Браслаўскага пав., бяруць на работу толькі тых, хто дасьць тэхніку магарыч. Хто багацейшы, той бутэльку гарэлкі прэ тэхніку, а бяднейшы апошнюю курыцу валачэ. — Так Мячыслава Лаўрыновіча ня прыймалі на работу, пакуль не занёс ён курку тэхніку. Дый то парабіў гэты М. Лаўрыновіч тры дні і разьлічылі,—йзноў „няма работы“; багацейшыя далі другі магарыч і засталіся,—ім ёсьць работа, а бедны прападай. Навет зароблены грошай ня зышчаш: пойдзеш да тэхніка,—тэхнік адсылае да інжэнера і наадварот. Ходзіць бедны чалавек, грошай не аддаюць, а дома дзеці плачуць хлеба...

× 26/IX. г. г. солтыс в. Кульгай, Празароцкай гм., Дзісьненскага пав., загадаў сваім сялянам вясьці коні на перагляд у фальв. Дужкі. Кінулі сяляне работу,—павялі, а фэльчар, які меў пераглядаць коні, кажа: „Пачакайце, я паеду да мястэчка, „załatwić“ свае справы. Сяляне чакаюць—і самы галодныя, і коні галодныя, бо як зыйшоў адзін конь на панскую пожню то пан—аж да бою —так раскрычаўся! Прыехаў фэльчар, налажыў акуляры, пабляяў штосьці і, бачучы, што ўжо вечар, адправіў сялян да хаты, — кажа: „Заўтра прыедзьце“!—Гэтак абходзяцца з сялянамі! Калі гэтак паступае фэльчар, то што-ж робяць большыя „шышкі“!?

× За ваенных часоў на нашай рэчцы Скідлянцы змарнованы мост. Цяпер яго строяць дзьве асобы — войт гміны Скідэль і „вялікі будаўнік і архітэктар“, як ён сябе называе—Сіткевіч. Гэная двойка няміласэрна ганяе сялян з усіх акалічных вёсак па дзерава, ведама, пры дапамозе Скідэльскага пастарунку. Цэлы год, амаль, вазілі сяляне дзерава, ужо хіба навазілі на тры такія масты, але мост строіцца чарапашым крокам. А чаму-ж так?—А таму, што „не хапае дзерава“. А куды-ж яно падзелася? А проста: яго прапілі гэныя п'яніцы! Удабавак Сіткевіч, з гэнага дзерава пабудаваў адрыну. А войт,—мусі затым, што мае прозьвішча Фурман,—без канца ганяе фурманкі — то ў лес, то з лесу.

× На гуляньні ў в. Тумілавічы, Дзісьненскага пав. 26. IX. г. г. скачучы паліцыянт здэрыўся з падпіўшым Алякс. Рабцом і паспрачаліся; дык зараз прыбылі яшчэ два паліцыянты і пацягнулі Рабца на пастарунак. А заступнік каманданта зараз прыбег разганяць гуляючых. Так і соваўся ён да спакойна скачучых дзяцюкоў і, трасучы рэвольвэрам пад нос, крычаў: „Вон быдла, хамы,— я вас навучу, як весяліцца!“

× Нядаўна на пагранічнай вартоўні каля в. Чыстае, Пліскае гміны, Дзісенск. п., застрэліўся жаўнер 7-га пагранічн. батальёну. Паходзіў ён з Вялейкі і быў за нешта перасьледаваны сваім плютановым. Як апавядаюць, апошні так зьдзекаваўся над нябошчыкам, што давёў апошняга да самагубства. Прыехаўшая камісія плютановага ўнявініла. Толькі нешта ды ёсьць тутака, — бо па ад'езьдзе камісіі пан плютоновы купіў дзеля рэшты жаўнераў парсюка і справіў ім добрую, вясёлую пагулянку. Відаць, нешта ды трэба было „падмазаць“...

× Арганісты Празароцкага касьцёлу (ў Дзісеншчыне) Кухажэўскі ня дадаў кс. Габшэвічу ці за мэтрыку, ці за хрэст—3 злотых, якія даў асабіста К. інтэрэсант. „Вялебны“ „ксянжуля“ гэтак пакрыўдзіўся і раззлаваўся на К., што выкінуў яго са службы. Неўзабаве К. знайшоў сабе пасаду арганістага ў м. Вішнева Сьвянцянскага павету. Але парафія дасталася малая, бедная, дык К. ня могучы карміць свае сям'і ў 9 душ і з адчаю застрэліўся.

× У двары Парафіянова, тэй-жа воласьці, Дзісьненскага павету „настаяцелем“ касьцёлу—ксёндз пралат Тэйзік. Вельмі добры ён „пастыр“ і дужа шчыра бярэцца за працу, каб нашы прыхаджане не марнаваліся, калі прыходзяць у касьцёл. Ня дужа даўно ўсе мы атрымалі „наказы“ па „колькасьці зямлі“, па якім мы павінны ўнясьці ад 10—50 зл. на адкрыцьце растарана пры касьцёле. У гэны растаран нашы прыхаджане будуць заходзіць пасьля імшы, каб за чаркай гарэлкі яшчэ бліжэй падыйсьці да „раю“.

Мы шчыра „дзякуем“ „ойчулькові“, што ён так „пячэцца“ аб нас грэшных!

× Воўк, напаўшы на селяніна Андрэя Макарэвіча з в. Акановічы, Цырынскай гм., Наваградз. пав.,—адкусіў яму вуха і кусок твару, але селянін аказаўся спрытным і забіў воўка. У в. Любанічах, Цырынск. гм., ваўкі авячок паелі, двое жарабят-пярэзімкаў і каня; у в. Асташын, Цыр. гм., зьелі трое цялят і двое жарабят, ды шмат такіх выпадкаў! А стрэльбу трымаць не пазваляюць!—Пазваляюць толькі паном, што маюць ня менш 100 гэкт. зямлі,—каб панскай жывіны ваўкі ня елі, а сялянскую—можна!

З Радавае Беларусі.

Беларусізацыя ў Случчыне.

У м. Слуцку сёлета пры 11 установах істнавалі курсы па вывучэньню супрацоўнікамі беларускае мовы. Акрамя паказаных курсаў пры ўстановах, былі арганізаваны агульныя курсы, якія наведвалі супрацоўнікі акруговага ваеннага камісарыяту, зямельнага аддзелу, інспэкцыі лясоў і аддзелу аховы здароўя.

Усяго ў горадзе на курсах беларусазнаўства налічвалася каля 349 слухачоў, здавала калёквіюмы 68, вытрымала — 20. Пры 7-мі ўстановах курсы былі адкладзены на восень і акрамя гэтых будуць мабыць і агульныя.

Па раёнах (7 раёнаў) пры кожным райвыканкоме істнавалі курсы, як для самога апарату, так і для працаўнікоў сельсаветаў і іншых раённых устаноў. У раёнах курсы наведвала 264 асобы (акрамя аднаго раёну, па якому няма вестак). Вытрымалі калёквіюмы па трох раёнах 54 асобы. У некаторых акруговых установах, а таксама і ў раёнах курсы зрабілі перапынак да восені, калі і будуць здавацца супрацоўнікамі калёквіюмы.

Амаль што ў кожным раёне істнавалі курсы сэкрэтароў сельсаветаў і старшынь, дзе вывучалася побач з іншым беларуская мова, і гэта дало добрыя вынікі.

Некаторыя ўстановы ў працы ўжо цалкам перайшлі на беларускую мову.

Беларусізацыя ў Віцебшчыне.

Беларусізацыя на Віцебскай арузе праходзіць больш марудна чым па другіх акругах Б.С.Р.Р. Вось, як піша аб гэтым „Савецкая Белар.“.

„Тлумачыцца гэта тым, што русіфікатарская палітыка царызму на Віцебшчыне пакінула глыбейшыя сьляды, чым у другіх мясцох Беларусі. У зьвязку з чым палітыка ажыцьцяўленьня беларусізацыі ўва ўсіх галінах савецкай, партыйнай і камсамольскай працы сустракаецца з вялікімі цяжкасьцямі.

„Выкладаньне ў беларускіх пачатковых школах і школах сямігодках амаль-што ўва ўсіх пераведзена на беларускую мову. Але разам з гэтым, усе тэхнікумы, прафшколы і вэтэрынарны інстытут працуюць на расейскай мове. Беларуская мова выкладаецца толькі, як прадмет. З палітасьветных школ для дарослых і школ партсеткі ў мінулым годзе таксама ніводная не працавала на беларускай мове. Разам з дасягненьнем тут ёсьць і недахваты. Неабходна было-б паступова пераводзіць выкладаньне на беларускую мову і ў тэхнікумах, інстытуце, і другіх беларускіх навучальных установах.

„Хаця канцалярская праца і перапіска ў большасьці сваёй пераведзена на беларускую мову, але-ж сам апарат як партыі, так і камсамолу і ў горадзе і на мясцох: райкомах, ячэйках, беларусізаваны яшчэ мала. Апарат акружкому партыі беларусізаваны ня больш як на 20-25 проц. і то большасьцю за кошт тэхнічных працаўнікоў. А беларусізацыю трэба разумець па нашаму ня толькі ў пераводзе на беларускую мову паперкі, а ў тым, каб партыйныя і камсамольскія працаўнікі ўжывалі беларускую мову на рабоце ў гутарках, у таварыскіх адносінах і г. д.

„Ёсьць яшчэ сярод асобных таварышоў і пшчолкінскія разважаньні адносна беларускай мовы.

„Наагул-жа, віцебская партыйная арганізацыя ў сучасны момант праводзіць вялікую працу па беларусізацыі свайго апарату. Ёсьць некалькі райкомаў, дзе апарат беларусізаваны амаль-што на 100 проц., у ты ліку сэкрэтары і сябры райкомаў.

„З беларусізацыяй савецкага апарату на першы пагляд здаецца нібы справа стаіць ня дрэнна. Але, калі прыглядзецца бліжэй, то можна заўважыць другое.

„Паводле праверкі некаторых акруговых установаў, прэзыдыум АВК цалкам перайшоў на беларускую мову, у той час, калі з праверaных 24 працаўнікоў АВК добра мову ведаюць толькі 5 асоб. Зусім ня ведаюць 16. Райвыканкомы беларусізаваны на 50 проц., а з праверaных 273 працаўнікаў раёнаў добра мову ведаюць толькі 25. Зусім ня ведаюць 200 асоб. Выпадкі пераходу на беларускую мову сельсаветаў вельмі рэдкія. Адгэтуль можна зрабіць вывады, што па савецкай лініі больш усяго беларусізуецца фармальна канцэлярыя, а не апарат. Пры тым слабая беларусізацыя нізавога савецкага апарату гаворыць за тое, што пытаньне неабходнасьці пераходу на беларускую мову не зразумела мясцамі, і дырэктывы АВК у гэтым былі не дастатачны.

„Каапэрацыйныя, банкавыя, гандлёвыя і іншыя ўстановы выключна працуюць на расейскай мове. З прафсаюзаў на беларускую мову перайшоў поўнасьцю толькі саюз асьветы і ў нязначнай меры саюз с.-г. і лясных рабочых. Ёсьць выпадкі пераходу на беларускую мову судовых устаноў і міліцыі“.

Беларусізацыя ў Смаленшчыне.

Хаця Смаленшчына асталася па-за межамі Радавае Беларусі і чакае на далучэньне да яе, беларусізацыя і тут ідзе наперад.

На 26-27 вуч. год Смаленскі губ. АНА зацьвердзіў гэткую сетку беларускіх школ: школ I ст.—22, з якіх 11 знаходзяцца ў Смаленскім пав. і 11 — у Рослаўскім і школ II ст.—дзьве: адна ў Смаленскім пав. і адна — у Рослаўскім; адна сямёхгадовая школа ў Смаленскім пав.

Школы, асабліва малодшыя клясы I ст., забясьпечаны падручнікамі на беларускай мове. Настаўніцтва падрыхтована да працы часткаю на Менскіх курсах, часткаю на Смаленскіх.

Вядома, што гэткая колькасьць школ не здаволіць запатрабаваньняў беларускага насельніцтва губэрні, але ў параўнаньні з мінулым годам і гэта сетка беларускіх школ зьяўляецца значным дасягненьнем у нацыянальным пытаньні.

Усячына.

Колькі жыхараў мае Вільня?

Паводлуг урадовых даных — 166.500 асоб. Апошні сьпіс насяленьня быў зроблены ў 1919 годзе. Ад гэтага часу лічба жыхараў бязумоўна пабольшылася.

Самы старадаўні музэй.

У часе раскопак у Мэсапатаміі адзін з рабочых раптам праваліўся ў нейкую глыбокую дзірку. Аказалася, што ён ўваліўся ў вялізарную залю, якая добра захавалася пад пяском пустэчы. Пры абсьледваньні гэтае залі знайшлі надпіс, згодна якога гэтая заля была пабудавана ў 550 годзе да нашае эры дачкой біблейскага цара Набоніда. Але больш цікава тое, што гэта заля аказалася музэем. Рэчы, якія ёсьць у гэтым музэі, маюць даўнасьць да 6.000 год і зараз дасьледуюцца архіалёгамі. Гэтыя рэчы бабілёняне зьбіралі ў часе земляных работ пры будове шляхаў і пасьля выстаўлялі ў памянёнай залі.

Паштовая скрынка.

Карэспандэнту, апісаўшаму, што Юрка Балабурка займаецца брахнёй на „Грамаду“. Бяз адрэсу і прозьвішча Вашага карэспанд. зьмясьціць ня можам.

Падпішчыку № 1987. Таго, як поп са шпіком пабіліся, апісваць ня будзем, бо гэта мала цікаўна.

Малаграматнаму. Карэспандэнцыяў, — як Ваша—бяз точных дадзеных і адрэсу з прозьвішчам карэспандэнта — не зьмяшчаем. Калі другі раз датарнуецеся да гэтых вымаганьняў, — ахвотна скарыстаем.

Каваліцкаму Гуртку і Прысутнаму. Весткі, пададзеныя Вамі, падходзяць у газэту па свайму зьместу, але — на жаль вы ня толькі не падалі прозьвішча і адрэсу аўтара гэтых вестак, але нават не далі неабходнейшых дадзеных як напрыклад — дзе гэта ўсё тварылася: — вёска, гміна, павет.

Грам. Цехановічу. Вы толькі падпісаліся, але ня выканалі таго, аб чым гаворыцца ў папярэднім адказе.

Сьвітцы. Вы маеце хваробу некаторых нашых карэспандэнтаў — не падаеце дакладных дадзеных, і таму некаторыя з карэспандэнцыяў ня могуць быць зьмешчаны, а іншыя няцікавы. З падходзячага скарыстаем.

Калясу. Карэсп. Ваша „Сьмерць сабачая і кацячая не падходзіць у газэту—няцікава.

Дзем. Іванову. Аб брахні асадніка Арлоўскага ня варта пісаць;—народ наш ведае цану ім і ніякай увагі на брахотню іх не звараччае ўвагі.

Масалянцу. Аб „комэдыйцы“ мы ужо адказалі Вам у паштовай скрынцы; мажа якраз таго нумару нашая „ўлада на мясцох“ Вам і не аддала. Што вам не даходзяць газэты, аб гэтым зьвярніцеся на пошту у Індуру: ці яна перадае нашы газэты ў Есьманты? і тады падайце нам рэклямацыю. Даведайцеся, хто там „падбірае“ нашы газэты, зьбярэце матэр'ял і прышлеце нам, то мы праз Сойм. Клюб. Белар. Сял.—Работ. Грамады падбярэм таго „ўхарца“.

Сялянам з в. Блудзеня. З Вашай весткі ня можна зразумець, хто і чые заняў каровы.

Серпову. Аб правакатару Мікалайчыку А. не зьмяшчаем, бо факты тут не перахопваючыя і мала важныя.

Сял. Бяздольнаму. Аб сватаўстве—выпадак няцікаўны, дык ня зьмешчана.

Карэспандэнту, апісваючаму, як паліцыя і Навагрудзкі староста перасьледаваў і пакараў сялян у сувязі з арганізацыяй гуртка „Грамады“ ў в. Канцэвічах. Весткі гэтай зьмясьціць ня можам з прычыны таго, што не падалі Вы свайго адрэсу і прозьвішча, дый факты ня ясна падалі.

Падпішчыку № 4062. Адказ на Вашае Запытаньне будзе зьмешчаны ў найбліжэйшым № нашай газэты ў аддзеле „юрыд. парады“.

Сьцяпулю Паўлінічу. Ува ўсёй Вашай стацьці высказвецца, што Паўлюкевіч — шчаня, якое брэша за кожную агрызеную костку, кінутую з панскага стала. Мы гэта ведаем і народ беларускі таксама добра ведае, аб чым сьведчаць цэлыя гурбы карэспандэнцыяў з пратэстамі проці гэнага здрадніка, якіх, аднак, як і Вашай, зьмяшчаць ня варта. Пішэце аб другом чым, — ахвотна скарыстаем.

Адважнаму. Вялікую чэсьць зрабілі-б мы, калі-б напісалі аб шпіку У. Гарбуну — слузэ Паўлюкевіча. Аб правале Паўлюкевічаўскага гуртка ў ваколіцы Гарбуна ня пішам, бо ўжо аб гэтым пісалі. Гэтага Гарбуна і „магіла не направіць“, а Павлюкевіч ужо так „сеў у калёшу“ што на заклік „Маланкі“: „Ванька — ўстанька“ — ён — ані з месца.

Зубру. Трэба ў карэспандэнцыі падаваць свой адрэс.

Аднаму з Капшоўцаў. З Вашай цікавай весткі, дзе Вы паміж іншым пішаце, што міравы судзьдзя ў м. Гарадышчы Наваградз. пав. пан Пшыгоцкі, на судзе за несправядлівыя пратаколы на сялян з в. Капшоўка Цырынскае гм. за калодзеж на апраўдываньні гэтых сялян сказаў: „Я больш веру аднаму паліцыянту, чым вам усім“, — зьмясьціць—на жаль—ня можам, бо не падалі Вы свайго прозьвішча. Аднак-жа гэтую справу мы перадалі ў Соймавы Клюб. Белар. Сял.-Работніц. Грамады.

Не грамадзіст той, хто не запісаўся ў сябры Т-ва Беларускае Школы!

Адказны Рэдактар: К. Вайтовіч. Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22. Выдавец пасол на Сойм П. Мятла.